С. Сідорскі ў Гданьску бярэ ўдзел у цырымоніі з нагоды 70-й гадавіны пачатку Другой сусветнай вайны

Прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей Сідорскі ў Гданьску бярэ ўдзел у цырымоніі з нагоды 70-й гадавіны пачатку Другой сусветнай вайны, перадае БЕЛТА.

Усяго на мерапрыемства прыехалі дэлегацыі амаль 30 краін. У цырымоніі ўскладання вянка на могілках абаронцаў Вестэрплатэ, дзе ў 1939 годзе прагрымелі першыя залпы Другой сусветнай вайны, таксама бяруць удзел канцлер Германіі Ангела Меркель і прэм'ер-міністр Расіі Уладзімір Пуцін, кіраўнікі ўрадаў Літвы, Латвіі, Эстоніі, Фінляндыі, Швецыі, Нідэрландаў, Чэхіі, Італіі, Славеніі, Францыі і іншых краін.

Прэм'ер-міністр Беларусі таксама абмяркоўвае ў Гданьску пытанні супрацоўніцтва з кіраўніцтвам польскага прадпрыемства АТ «Электрабудова». Прадукцыя ВА «Электрабудова» і тэхналагічныя рашэнні, што ўкараняюцца на ім, могуць быць выкарыстаны пры мадэрнізацыі дзейных і будаўніцтве новых генерыруючых магутнасцяў у Беларусі, напрыклад, Зэльвенскай вугальнай электрастанцыі і будучай беларускай АЭС. АТ «Электрабудова» гатова разгледзець любы прымальны для беларускага боку варыянт супрацоўніцтва ў гэтай галіне.

ДВА «Белэнерга» са свайго боку пацвердзіла зацікаўленасць у практычнай прапрацоўцы пытанняў наладжвання супрацоўніцтва з польскім прадпрыемствам.

У Паўночна-заходняга аператыўнага камандавання Узброеных Сілаў новае кіраўніцтва

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка сваім указам назначыў генерал-маёра Івана Чавуса камандуючым войскамі Паўночна-заходняга аператыўнага камандавання Узброеных Сілаў Рэспублікі Беларусь, вызваліўшы яго ад пасады начальніка штаба — першага намесніка камандуючага войскамі Паўночна-заходняга аператыўнага камандавання Узброеных Сілаў Рэспублікі Беларусь.

Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі палкоўнік Андрэй Раўкоў назначаны начальнікам штаба — першым намеснікам камандуючага войскамі Паўночна-заходняга аператыўнага камандавання Узброеных Сілаў Рэспублікі Беларусь.

С. Барысёнак вызвалены ад пасады камандуючага войскамі Паўночна-заходняга аператыўнага камандавання УС Беларусі

Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь генерал-маёр Сяргей Барысёнак вызвалены ад пасады камандуючага войскамі Паўночна-заходняга аператыўнага камандавання Узброеных Сілаў Рэспублікі Беларусь і звольнены з ваеннай службы ў запас па хваробе.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Сур'ёзная перавага Беларусі ў высокім інтэлектуальным патэнцыяле яе моладзі

Пра гэта заявіў у Мінску на прэс-канферэнцыі з нагоды завяршэння сваіх паўнамоцтваў Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Злучанага Каралеўства Вялікабрытаніі і Паўночнай Ірландыі ў Рэспубліцы Беларусь Найджэл Гулд-Дэвіс, перадае БЕЛТА.

«Не сакрэт, што Беларусь, як і ўсе краіны, выпрабоўваецца сусветным глабальным крызісам. Для ўсіх нас гэта беспрэцэдэнтны выклік. Вельмі важна, каб мы заставаліся адкрытымі адзін для аднаго. Не выпадкова для Беларусі адкрыліся новыя магчымасці не толькі з боку ЕС, але і іншых арганізацый — МВФ, Сусветнага банка і інш. Крызіс вымушае ўсе краіны прымаць цяжкія, балючыя рашэнні. Ёсць агульная думка, што ў свеце пасля крызісу з'явіцца больш абмежаванняў, чым было да яго. Канкурэнцыя стане больш жорсткай, і ўсім нам давядзецца бегчы з усіх ног, каб хоць бы застацца на ранейшым месцы», — адзначыў дыпламат.

Але, паводле слоў Найджэла Гулд-Дэвіса, у Беларусі ёсць адна сур'ёзная перавага — гэта моладзь. «Беларуская моладзь не перастае ўражваць мяне сваёй прыстойнасцю, здольнасцямі і працоўнай этыкай. У ёй сканцэнтраваны бязмерны патэнцыял», — сказаў ён.

Пасол прывёў прыклад вялікага інтэлектуальнага патэнцыялу беларускай моладзі, які заключаецца ў тым, што ўсё больш міжнародных кампаній і арганізацый размяшчаюць заказы на распрацоўку праграмнага забеспячэння ў Беларусі. «У тым ліку Лонданская фондавая біржа. Задумайцеся, у Беларусі ствараюцца праграмы для самага вялікага фінансавага цэнтра ў свеце. Я сам пра гэта даведаўся толькі нядаўна і нават не мог уявіць, што такое магчыма, калі не прыехаў бы ў Беларусь», — рэзюмаваў Найджэл Гулд-Дэвіс.

На слыху

Несанкцыянаваны палёт у Рэчыцкім раёне мог зрабіць былы ваенны лётчык

Транспартная міліцыя ўстанавіла кола асобаў, якія тэарэтычна маглі ажыццявіць несанкцыянаваны палёт у Рэчыцкім раёне Гомельскай вобласці. Аб гэтым карэспандэнту БЕЛТА паведаміў прэс-сакратар УУС на транспарце МУС Аляксандр Марчанка.

Паводле яго слоў, пошукі самалёта, які праляцеў пад чыгуначным мостам паблізу вёскі Белае Балота Рэчыцкага раёна, супрацоўнікі міліцыі вядуць ужо больш за месяц. На сёння праверана 47 вёсак, размешчаных у 40-кіламетровай зоне ад Рэчыцы, апытана мноства жыхароў, прадаўжаюцца аператыўна-вышуковыя мерапрыемствы па некалькіх версіях.

Па адной з іх устаноўлена некалькі чалавек, якія тэарэтычна маглі ажыццявіць палёт у гэты час пад мостам. Сярод іх ёсць і былыя ваенныя лётчыкі. Цяпер ідзе праверка па ўстанаўленні канкрэтнага пілота. Акрамя гэтага, былі выяўлены два самалёты заводскага вырабу тыпу «Авіятыка-МАІ», якія належаць аднаму з прыватных прадпрыемстваў. Пілоты, якія маглі кіраваць гэтымі самалётамі, таксама правяраюцца на датычнасць да правядзення палёту.

У час пошукаў супрацоўнікі транспартнай міліцыі выявілі яшчэ мноства іншых дэльтапланаў, парапланаў і самаробных лятальных аб'ектаў, пра якія раней не было вядома. Многія з іх знаходзіліся ў разабраным і нерабочым стане, аднак парушэнняў правілаў рэгістрацыі ва ўладальнікаў тэхнікі не было. Удалося ўстанавіць чалавека, які яшчэ ў пачатку 90-х гадоў мінулага стагоддзя зрабіў аналагічны палёт над мостам, аднак яго датычнасць да гэтага здарэння не ўстаноўлена.

Як паведамлялася, 24 ліпеня жыхары вёскі Белае Балота Рэчыцкага раёна назіралі, як аднаматорны самалёт без апазнавальных знакаў праляцеў пад чыгуначным мостам.

P.S. Як учора паведаміў партал Lenta.ru, міліцыянеры ўжо знайшлі самалёт, на якім быў здзейснены палёт. Паводле папярэдняй інфармацыі за штурвалам знаходзіўся бізнэсмен, былы вайсковец.

УРОК, З ЯКОГА ЗА ВУШЫ НЕ ВЫЦЯГНЕШ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Многія ўжо абяцаюць завітаць сюды, ды і сяброў прывесці. Яшчэ б, з новенькай трэнажорнай залы малых не выцягнуць, яны налятаюць на трэнажоры, акупуюць веладарожку, сапуць, скардзяцца, што ўжо і ногі баляць, але пасля перабіраюцца на іншыя трэнажоры і працягваюць займацца, так, што нават адна з маці, што завітала на адкрыты ўрок да дачкі, спакусілася на велатрэнажор і круціла педалі з не меншым імпэтам, чым дзеці. Пасля юным гасцям паказваюць шыкоўныя спартыўную і харэаграфічную залы, дзе прафесіяналы дэманструюць, чаму можна навучыцца, калі займацца пэўны час хіп-хопам, брэйк-дансам ці мастацкай гімнастыкай. «Мы тут нават плануем распачаць танцавальныя курсы для маладажонаў і выпускнікоў школ, каб яны годна выглядалі падчас урачыстасцяў, — заўважае спецыяліст аддзела маркетынга Шматфункцыйнага спартыўна-культурнага комплексу «Мінск-арэна» Алена Харужэнка. — І тут могуць займацца не толькі спартсмены, а ўсе ахвотныя. Прычым як у трэнажорнай, спартыўнай і харэаграфічнай залах, так і там, дзе знаходзіцца ядро веладрома. Выключна для спартсменаў прызначаны толькі велатрэк з насцілам з сібірскай сасны». Займацца тут можна малым і дарослым. Самастойна і з трэнерамі. Да слова, гадзіна ў новенькай трэнажорнай зале каштуе 5 тысяч.

Чаму вучаць 1 верасня?

Як трымаць ракетку, калі ты гуляеш у бадмінтон? Як стаць лерам і колькі каштуюць роліканькі? З чаго зроблена рама і якімі павінны быць колы і сядло шасэйнага веласіпеда? Якія складаныя практыкаванні можна засвоіць, калі займацца брэйкам паўгода?

Пра ўсё гэта і многае іншае можна было даведацца падчас урока ў «Мінск-арэне». Тут жа дзеці прымералі спартыўную экіпіроўку, фатаграфаваліся са спартсменамі.

А яшчэ можна было адразу падабраць для сябе від спорту: трэнеры розных спартыўных школ запрашалі хлопчыкаў і дзяўчат да сябе.

«Захочаце экстрыму, каб кроў грала ў жылах — прыходзьце да нас скакаць па трамплінах. Нам патрэбны каардынаваныя дзяўчаткі, смелыя, рухавыя, — завабліваў дзяцей у веласпорт заслужаны трэнер рэспублікі па байміксе Уладзімір Церлюкевіч. — У любым відзе спорту, калі вы будзеце займацца ім не месяц і не год, магчыма стаць чэмпіёнамі. А яшчэ вы будзеце моцнымі, здаровымі, прыгожымі».

Уладзімір Антонавіч заўважае, што не так важна, які від спорту абяруць дзеці, але галоўнае, каб яны ім займаліся — гэта аздараўленне нацыі, залаты фонд краіны.

А каб дзеці не сыходзілі, неабходна, каб спорт стаў справай сямейнай, калі мама і тата будуць займацца разам са сваімі дзецьмі, для малых гэта будзе вельмі істотна і яны не стануць кідаць секцыі.

А мо ёсць сэнс правесці падобныя спартыўныя ўрокі і для бацькоў?

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ. Фота аўтара.

Мінскі метрапалітэн з 1 верасня перайшоў на зімовы рэжым работы

Мінскі метрапалітэн з 1 верасня перайшоў на зімовы графік руху электрапаяздоў, паведамілі БЕЛТА ў службе руху сталічнай падземкі.

Летні графік у метро дзейнічае з 1 ліпеня па 31 жніўня. З-за зніжэння ў гэты перыяд пасажырапатоку памеры руху электрапаяздоў (колькасць пар паяздоў за адну гадзіну. — Заўвага БЕЛТА.) скарачаюцца.

З 1 верасня ў рабочыя дні на першай лініі метро ў час пік за гадзіну будуць праходзіць 30 пар паяздоў замест 20, як гэта было летам. У вячэрні час у час пік памер руху складзе 24 пары паяздоў за гадзіну (было 15). На другой лініі ў ранішні час пік за гадзіну будуць праходзіць 24 пары паяздоў замест 17, у вячэрні — 20 пар замест 15. У выхадныя дні на першай лініі падземкі ўдзень за адну гадзіну будуць праходзіць 24 пары паяздоў замест (было 11—12), на другой лініі — 13 пар (10).

На дзвюх лініях мінскага метрапалітэна, працягласць якіх складае 30,3 км, пасажырай перавозяць 49 электрапаяздоў (220 вагонаў). За суткі яны выконваюць 1245 рэйсаў.

Чэкісты — падшэфнай школе

Узнагароды на Дзень ведаў

Кіраўнікі Рэспубліканскага камітэта Беларускага прафсаюза работнікаў органаў дзяржаўнай бяспекі і савета Афіцэрскага сходу Камітэта дзяржбяспекі па традыцыі наведалі ў Дзень ведаў сваіх падшэфных — Цясноўскую сярэднюю школу імя Ф.Э. Дзяржынскага Стаўбцоўскага раёна.

На ўрачыстай лінейцы, што адбылася ўчора, сямёра лепшых вучняў, імянных стыпендыятаў і ўдзельнікаў уборачнай гарачай пары атрымалі ад шэфаў узнагароды. З удзелам гасцей у 11 класе адбыўся адкрыты ўрок.

Святлана БАРЫСЕНКА.

ЗАЛАТЫ МЕДАЛЬ — БЕЛАРУСКАМУ ПІВУ

Прадукцыя ААТ «Крыніца» ўдастоена Залатога медаля «За дасягненне высокіх вынікаў у паляпшэнні якасці харчовай прадукцыі» на Міжнароднай аграпрамысловай выставе-кірмашы «Аграрусь-2009», што прайшла ў Санкт-Пецярбургу.

Высокай узнагародай былі ўшанаваны адразу тры гатункі піва: «Крыніца класічнае люкс», «Крыніца экспартнае», «KULT пшанічнае цёмнае».

Выстава-кірмаш «Аграрусь» праводзіцца штогод пры падтрымцы Урада Расійскай Федэрацыі і Міністэрства сельскай гаспадаркі Расіі, традыцыйна ў ёй бяруць удзел больш за 40 рэгіёнаў Расійскай Федэрацыі, іншыя краіны.

Наведвальнікі выставы-кірмашу вылучылі асноўныя перавагі прадукцыі ААТ «Крыніца»: высокая якасць, выдатны смак і ўмераныя цэны.

Сяргей СТАРЫНАЎ.

Выселіць бацьку можна нават без выдзялення яму іншага жылля

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

Са Слуцкага раёна (дакладныя месца жыхарства заяўнікаў і іх прозвішчы мы не называем па прычынах, што стануць зразумелымі крыху ніжэй) на «гарачую лінію» газеты паступіла не зусім звычайная просьба: падкажыце, як выселіць з дома... бацьку і колішняга мужа. Сітуацыю ўскладняла пэўная блытаніна з дакументамі на нерухомасць, што меліся або адсутнічалі на руках у абодвух бакоў. Але напачатку паслухаем саміх заяўнікаў.

— Бацька прыйшоў, як кажуць, на ўсё гатовае — дом і гаспадарчыя пабудовы ўжо былі — каля 30 гадоў таму. Калі яго прапісвалі ў сельскім Савеце, чамусьці афармілі ў асобную гаспадарку, хоць бацька нічога свайго не меў і карыстаўся ўвесь час тым, што было. За ўсё — падаткі, страхоўку — увесь час плаціла маці. Грошай на гэта ад бацькі не было, ён усе прапіваў, пачаў падымаць руку на маці. Яна, дарэчы, мае інваліднасць. Некалькі гадоў таму бацькі скасавалі шлюб, аднак бацька па-ранейшаму пражывае з намі разам. У іншым населеным пункце ў яго ёсць хата, што засталася яму ад яго бацькоў. Маці завяшчання не пакінула, у тым жыллі зараз пражывае яго брат. І вось усё вышэйпералічанае нам надакучыла, мы хочам выселіць бацьку. Як гэта можна зрабіць? — пыталіся ў нас.

Найперш трэба было высветліць, хто ж дакладна з'яўляецца ўласнікам жылога дома. Шмат гадоў таму ў сельскім Савеце маглі напісаць што заўгодна. Паводле слоў заяўнікаў, дакументаў там не захавалася. Ці рэгістравалі людзі нерухомасць ужо згодна з новымі патрабаваннямі? Пасля звароту ў **Слуцкі філіял агенцтва па рэгістрацыі і зямельным кадастры, а таксама да саміх заяўнікаў** высветлілася (знайшліся дакументы, атрыманыя некалькі гадоў таму), што такую працэдуру яны праходзілі. Калькі мы зразумелі, уласнікам дома з'яўляецца маці, у бацькі ніякіх новых дакументаў, акрамя нейкай колішняй даведкі, пра якую мы гаварылі, няма. Пацвярджаецца гэта і ўскоснымі дакументамі, напрыклад, даведкай, што спатрэбілася для вучобы аднаму з членаў сям'і.

Калі гэта сапраўды так і бацька не з'яўляецца ўласнікам жылля, можна спаслацца на артыкул 39 Жыллёвага кодэкса Рэспублікі Беларусь «Высяленне без выдзялення грамадзянам жылога памяшкання». У ім гаворыцца, што калі наймальнік, члены яго сям'і ці іншыя асобы, якія пражываюць сумесна з ім, сістэматычна разбураюць ці псуюць жылое памяшканне, або выкарыстоўваюць яго не па прызначэнні, або сістэматычным парушэннем правілаў карыстання жылым памяшканнем робяць немагчымым для іншых пражыванне з імі ў адной кватэры ці ў адным доме, а меры папярэджання і грамадскага ўздзеяння былі безвыніковымі (паводле слоў заяўнікаў, бацьку нават давалі 15 сутак, аднак свае паводзіны ён не змяніў; але адзін такі выпадак нельга лічыць сістэмай — **С.Р.**), высяленне вінаватых па патрабаванні наймадаўцы ці іншых зацікаўленых асобаў праводзіцца ў судовым парадку без выдзялення іншага жылога памяшканне. Грамадзяне, што падлягаюць высяленню без выдзялення іншага жылога памяшкання, па патрабаванні наймадаўцы могуць быць абавязаны судом узамен высялення правесці абмен займаемага жылога памяшкання на іншае жылое памяшканне.

Далей звернемся да артыкула 120 таго ж кодэкса — «Высяленне членаў сям'і ўласніка жылога памяшкання». Там сказана, што «члены сям'і ўласніка жылога памяшкання, якія не маюць права ўласнасці на долю ў жылым памяшканні, могуць быць выселены з жылога памяшкання ў судовым парадку без выдзялення іншага жылога памяшкання на падставах, прадугледжаных артыкулам 39 кодэкса або на падставе пісьмовага пагаднення пры засяленні, якія не супярэчаць заканадаўству Рэспублікі Беларусь. Калі поўнагадовыя члены сям'і ўласніка, што пражываюць сумесна з ім, маюць у гэтым населеным пункце іншае жылое памяшканне, што належыць ім на праве ўласнасці, дык па патрабаванні ўласніка яны падлягаюць высяленню ў гэта жылое памяшканне». Як было сказана вышэй, у бацькі ёсць бацькоўская хата ў іншай вёсцы, таму выселіць яго туды немагчыма. Зноў жа, паколькі завяшчання на тую хату не было, уступіць у права спадчыны ён і яго брат павінны праз пэўны тэрмін. Нам не вядома, ці прайшоў ён. Аднак уступіць у права спадчыны можна і пасля заканчэння гэтага тэрміну — у судовым парадку. Бацька і колішні муж заяўнікаў мае на гэта поўнае права — прэтэндаваць на пэўную частку жылога памяшкання. З іншага боку, ён таксама мае права адмовіцца ад прыняцця спадчыны... У адстойвані сваіх інтарэсаў і спакойнага жыцця, калі заяўнікі лічаць гэта неабходным, ім трэба дзейнічаць праз суд.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Абзац

◢ Дэпартамент па меліярацыі і воднай гаспадарцы Мінсельгасхарчу Беларусі сумесна з рыбгасамі і адміністрацыяй Фрунзенскага раёна сталіцы пачынаюць сезон восеньскіх кірмашоў па продажы рыбы. Першы з іх пройдзе 5 верасня на пляцоўцы каля мінскага Лядовага палаца. Кірмаш будзе працаваць з 9 да 17 гадзін. Плануецца, што ў ім прымуць удзел 9 рыбгасаў. У асартыментным пераліку — карп, таўсталобік, фарэль, белы амур, асятровыя, а таксама рачная рыба. Будуць прапанаваныя і прадукты перапрацоўкі — вэнджаная рыба, наборы для юшкі і інш. Можна будзе таксама пакаштаваць юшку, барбекю з рыбы. Рыба і рыбапрадукты будуць прадавацца па цане вытворцаў.

◢ **У Мінску ў дзень горада, 12 верасня, у месцах масавых гулянняў продаж спіртнога будзе забаронены, паведамлялася ўчора на прэс-канферэнцыі ў Мінгарвыканкаме.**

◢ Суд Першамайскага раёна г. Мінска прызначыў ад 2 да 7 сутак адміністрацыйнага арышту футбольным балельшчыкам, што ўдзельнічалі ў бойцы ў сталіцы. Пакаранне будуць адбываць каля 10 балельшчыкаў. Яшчэ больш за 30 удзельнікаў бойкі павінны будуць па рашэнні суда заплаціць штраф у памеры ад 3 да 25 базавых велічынь.

◢ **Жыхарка адной з вёсак Петрыкаўскага раёна 1936 г.н. памерла ад апёкаў, атрыманых падчас спальвання смецця ва ўласным двары. Яна распаліла вогнішча на падвор'і і спальвала расліннасць, прыбраную з прысядзібнага ўчастка. Па неасцярожнасці жанчына ўпала ў вогнішча, у выніку чаго атрымала апёкі трэцяй ступені, ад якіх памерла ў раённай бальніцы.**

◢ Пяцёра дзяцей атрымалі раненні ў выніку ДТЗ за адны суткі на дарогах Беларусі. Так, у Мінску 26-гадовы мясцовы жыхар, кіруючы аўтамабілем «Пежо-306», на дваровай тэрыторыі наехаў на 4-гадовае дзіця, пасля чаго знік. У ходзе аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў аўтамабіль і вадзіцель выяўленыя. У Мазырскім і Уздзенскім раёнах аўтамабілісты паранілі хлопчыкаў на веласіпедах.

◢ **Адной з найбольш верагодных прычын маштабных пажараў, што ахапілі наваколле грэчаскай сталіцы ў перыяд з 21 па 24 жніўня на плошчы, большай за 20 тыс. га, і пашкодзілі больш за 200 дамоў, з'яўляецца падпал, лічыць мясцовая паліцыя. Вінаўнікам пажару можа быць прызнаны мясцовы селянін, які спрабаваў пры дапамозе агню пазбавіцца ад асінага гнязда ў полі непадалёк ад свайго дома ў вёсцы Граматыка, што размешчана на паўночным усходзе ад Афінаў. На гэтым месцы было знойдзенае абгарэлае асінае гняздо, а побач — некалькі пустых бутэлек з-пад гаручай вадкасці. Між тым сам падазроны адмаўляе сваю віну. Праводзяцца расследаванні.**

Поўны абзац

◢ Кватэра ў Будапешце і машына чакаюць пераможцу першага ў свеце афіцыйнага конкурсу Міс пластычная хірургія. Незвычайны конкурс павінен адбыцца ў сталіцы Венгрыі сёлетняй восенню. У ім будуць прымаць удзел жанчыны і дзяўчаты ад 18 да 30 гадоў, што рабілі пластычныя аперацыі на твары або на целе. На якіх менавіта частках цела адбывалася хірургічнае ўмяшанне — не мае значэння. Галоўнае, каб праца хірургаў мела дакументальнае пацвярджэнне, а сама аперацыя праводзілася пад мясцовым або агульным наркозам. Журы конкурсу ўзначальваюць вядучыя пластычныя хірургі Венгрыі.

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

Здарэнні

ТРАПІЛІ ПАД КАМБАЙНЫ

Два падобныя няшчасныя выпадкі здарыліся ў апошні дзень лета на Брэстчыне. Каля вёскі Ляплёўка Брэсцкага раёна пад жняярку камбайна, якім кіраваў 50-гадовы механізатар, трапіў 47-гадовы мясцовы жыхар. Няшчаснаму перарэзала ногі, ён дастаўлены ў бальніцу. А побач з вёскай Чамля Пінскага раёна такім жа чынам атрымала траўму нагі пенсіянерка 1930 года нараджэння. Праз некалькі гадзін жанчына памерла ў бальніцы. Праводзіцца праверка надзвычайных здарэнняў.

Яна СВЕТАВА.

ВОСЕНЬ, А ЛЮДЗІ ТОПЯЦЦА

Нягледзячы на тое, што вада ўжо халодная, аматары купання лезуць у вадаёмы і... За апошнія два дні жніўня на Брэстчыне ўтапіліся трое.

На возеры Катышы, што ў Кобрынскім раёне, знайшлі тапельца — 23-гадовага хлопца. А каля в. Малыя Косічы (Брэсцкі раён) у меліярацыйным канале таксама ўтапіўся малады чалавек. І на рэчцы Случ, побач з в. Вільча Лунінецкага раёна, пайшоў на дно 42-гадовы мужчына.

ВІЛЫ Ў СЭРЦА

У в. Анісімавічы (Баранавіцкі раён) пасля выпіўкі два мужчыны наладзілі скандал.

Пад руку трапілі вілы, і адзін з іх атрымаў удар у грудзі.

Пацярпелы з раненнем сэрца апынуўся ў бальніцы.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Спорт-тайм

ПЕРШЫ ЭТАП ПРАЙШЛА ТОЛЬКІ АЗАРАНКА

У Нью-Ёрку стартаваў адкрыты чэмпіянат ЗША па тэнісе — US Open.

Вікторыя Азаранка (8 нумар сусветнага рэйтынгу) у першым матчы абыграла румынку Аляксандру Дулгеру — 6:1, 6:1. Анастасія Якімава выбыла з адзіночнага разраду, саступіўшы ў першым крузе амерыканцы Ване Кінг. У першым сэце пры ліку 2:1 на карысць амерыканскай тэнісісткі наша суайчыннііца не змагла прадоўжыць гульню. Таксама з адзіночнага разраду пасля першага круга выбыла Вольга Гаварцова, якая саступіла прадстаўніцы Індыі Сані Мірзе — 2:6, 6:3, 3:6.

У БАРЫСАВЕ ВЫЗНАЧЫЛІСЯ ЦЁЗКІ

Вынікам вячэрняга матчу ў панядзелак у Барысаве паміж двума флагманамі беларускага футбола — цяперашнім і былым — стала баявая нічыя. На гол мінскага дынамаўца Сяргея Кісляка з пенальці дакладным ударам напрыканцы матча адказаў лепшы бамбардзір чэмпіянату краіны Сяргей Крывец. У выніку пасля 17 тураў БАТЭ мае ў актыве 38 ачкоў, следам ідзе з 28 ачкамі тройка «Нафтан», «Шахцёр» і «Дынама» (Мінск).

МАЙСТАР ПА КУБІКУ

Беларускі студэнт Анатоль Кім заняў першае месца на міжнародных спаборніцтвах у Санкт-Пецярбургу па спідкубінгу (хуткаснай зборцы кубіка Рубіка) у намінацыі «зборка адной рукой».

У афіцыйным міжнародным турніры Saint Petersburg Open 2009 прынялі ўдзел больш за 40 чалавек з Беларусі, Расіі і Украіны. У праграму былі заяўленыя 12 намінацый. У намінацыі «зборка кубіка Рубіка 3х3 адной рукой» чэмпіён Беларусі Анатоль Кім заняў першае месца з вынікам 27 сек. У намінацыі «магія Рубіка» ён таксама заняў першае месца з вынікам 1,66 сек. У падарунак ад арганізатараў Анатоль атрымаў новую галаваломку Эрна Рубіка «Шарык Рубіка».

БАСКЕТБАЛІСТЫ ЗГУЛЯЮЦЬ З ГРУЗІЯЙ

Баскетбалісты зборнай Беларусі ў плей-оф чэмпіянату Еўропы сустрэнуцца з камандай Грузіі. Першы матч за права выступіць у наступным сезоне ў найвышэйшым дывізіёне беларусы правядуць 5 верасня ў Магілёве, а 9-га згуляюць у Тбілісі. У апошнім матчы групавога турніру наша каманда абыграла зборную Кіпра — 77:70.

ПРЕДЛОЖЕНИЕ О ПОКУПКЕ АКЦИЙ ОАО «ТЕХНОБАНК»

1. Фамилия, имя, отчество, место жительства покупателя акций: Курач Игорь Александрович, проживающий по адресу: 220022, город Минск, улица Горецкого, дом 77, квартира 37.

2. Полное наименование, местонахождение эмитента, акции которого приобретаются: Открытое акционерное общество «Технобанк», 220002, город Минск, улица Кропоткина, 44.

3. Количество акций, которое намеревается приобретать покупатель: 484 843 (Четыреста восемьдесят четыре тысячи восемьсот сорок три) штуки.

4. Цена, по которой покупатель намерен приобретать акции: по цене приобретения продавцом 5 (Пять) белорусских рублей за 1 (Одну) акцию.

5. Форма, порядок и сроки оплаты акций: оплата в безналичной форме в белорусских рублях через расчетно-клиринговую систему ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа» в день совершения сделки (код расчетов S-T+0).

6. Адрес, по которому будет совершаться покупка акций: город Минск, улица Сурганова, 48А, Открытое акционерное общество «Белорусская валютно-фондовая биржа».

7. Дата начала и окончания покупки акций: 9 сентября — 11 сентября 2009 года.

И.А. Курач

МОГИЛЕВСКИЙ ГОРОДСКОЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ СООБЩАЕТ:

с аукциона на право заключения договоров аренды земельных участков, объявленного на 10 сентября 2009 года в 16.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а,

СНИМАЕТСЯ ПРЕДМЕТ АУКЦИОНА — ЛОТ № 4.

Примечание: информация опубликована 11 августа 2009 года в газете «Звязда» № 148 (26506).

Контактный телефон в городе Могилеве 22 11 63.

МНПЗ БУДЗЕ ІНВЕСТАВАЦЬ НЯГЛЕДЗЯЧЫ НА ДВУХРАЗОВАЕ СКАРАЧЭННЕ ПРЫБЫТКУ

Мазырскі нафтаперапрацоўчы завод згортваць свае інвестыцыйныя праграмы па развіцці прадпрыемства не збіраецца, пра што паведаміў **генеральны дырэктар ААТ «МНПЗ» Анатоль КУПРЫЯНАЎ:**

— Я належу да тых кіраўнікоў, якія лічаць, што трэба выкарыстоўваць момант для нарошчвання інвестыцыйных праграм, каб адарвацца тэхналагічна ад прадпрыемстваў-канкурэнтаў.

На сёння на МНПЗ дзейнічае праграмма развіцця на 2005—2010 гады, першы этап якой ужо завершаны: пабудаваныя ўстаноўка па вытворчасці бензолу, два рэзервуары па 30 тысяч тон для захоўвання нізкасярністай нафты, установка па ўтылізацыі факельных газаў, і самы буйны аб'ект — установка фторыста-вадароднага алкіліравання. Усяго капітальныя ўкладанні на гэтым этапе склалі 214,1 мільёна долараў.

— Установка фторыста-вадароднага алкіліравання пабудавана ўпершыню на нафтаперапрацоўчых прадпрыемствах былога Савецкага Саюза па такой тэхналогіі, яна забяспечвае вытворчасць 300 тысяч тон алкілату — кампанента для вытворчасці бензінаў еўрапейскіх стандартаў, — сказаў Анатоль Купрыянаў. — Яна дазволіла значна нарасціць вытворчасць высокаактанавага бензіну і практычна за 1,5 года была акуплена за кошт дадатковай выручкі.

На другі этап рэканструкцыі завода запланавана будаўніцтва аб'ектаў на суму каля 479 млн долараў ЗША, з якіх ужо выдаткавана 367 млн на закупку абсталявання і ліцэнзій, праектныя і будаўніча-мантажныя працы. Кіраўніцтва завода чакае запуску новых а'ектаў у вызначаны тэрмін — у 2010 годзе.

— У першым квартале 2010 года будзе працаваць установка па гідраачысткі бензіну каталітычнага крэкінгу, у другім квартале — установка па вытворчасці вадароду. Запусцім таксама ўстаноўку па гідраачысткі дызельнага паліва па тэхналогіі Французскага інстытута нафты, якая дазволіць атрымліваць дызельнае паліва перспектыўных еўрапейскіх патрабаванняў недзе да ўзроўню 2015 года, — расказаў генеральны дырэктар.

Ужо ўкладзена 13 мільёнаў долараў на 3 і 4 этапы рэканструкцыі — на закупку ліцэнзій, на выкананне часткі базавых праектаў. Змяняць інвестыцыйныя праграмы ААТ «МНПЗ» пакуль не мае намеру, нягледзячы нават на тое, што прыбытак прадпрыемства з-за змянення цэнаў у свеце на нафтапрадукты паменшыўся ў два разы пры тых жа аб'ёмах вытворчасці. Толькі пакуль прыпынена стварэнне ўстаноўкі па вытворчасці параксілолу, бо будаўніцтва вельмі дарагое, а цяпер наладжваюцца кантакты па пастаўках параксілолу на магілёўскае хімвалакно з Расіі і няма мэтазгоднасці ў будаўніцтве ўстаноўкі на МНПЗ. Таму разглядаецца прапанова выключыць будаўніцтва гэтай установкі з праграмы развіцця, і на гэтыя 223 млн долараў пабудаваць іншыя аб'екты.

Неабходнасць пастаяннага інвеставання ў развіццё вытворчасці, а за першае паўгоддзе 2009 года інвеставана Br298,8 млрд у параўнанні з леташнімі Br172,1 млрд, гендырэктар Анатоль Купрыянаў патлумачыў так :

— Патрабаванні на міжнародным рынку становяцца ўсё больш жорсткімі. І каб паспяваць за той якасцю, якую патрабуюць сусветныя рынкі, трэба пастаянна ўкараняць новыя працэсы. Тое, што мы робім па 2-м і 3-м этапах, дазволіць вырабляць паліва перспектыўных параметраў якасці.

Але і цяпер прадпрыемства не мае ніякіх праблем з продажам прадукцыі:

— Я даўно працую дырэктарам завода і магу сказаць, што ніколі не існавала праблемы з-за назапашвання нафтапрадуктаў па прычыне адсутнасці збыту. Такіх праблем у нас няма і цяпер, — сцвярджае Анатоль Купрыянаў.

Пры гэтым на заводзе ўсё ж думаюць пра пашырэнне парка захоўвання паліва, але гэта, як сказаў дырэктар, «ад доўгага жыцця» і на выпадак пазаштатных сітуацый:

— Наш завод, які працуе на штодзённай загрузцы ў 31,5 тыс. тон, пры збоях, напрыклад, пастаўкі чыгуначных цыстэрнаў з-за шторму ў портах Балтыкі, можа апынуцца ў сітуацыі, калі трэба будзе не толькі паменшыць сваю прадукцыйнасць, але і амаль поўнасцю спыніцца.

Усяго ААТ «МНПЗ» мае магутнасць па перапрацоўцы нафты ў 12 млн тон за год, з якіх загружана каля 11 млн тон. Асноўныя прадукты, на якія перапрацоўваецца нафта, гэта аўтабензіны (каля 2,5 млн тон за год) і дызельнае паліва (каля 2,4 млн тон за год), ёсць і пабочныя — асвятляльны керасін, бензін піроліза, бензол, сера, бітум і гэтак далей. Каля 70 % з агульнага аб'ёму таварнай прадукцыі пастаўляецца на экспарт, а астатняе — спажываецца ўнутры краіны. У першым паўгоддзі 2009 года экспарт склаў $703 млн, рэнтабельнасць рэалізаванай прадукцыі — да 7 %, чысты прыбытак — да $30 млн.

Павел БЕРАСНЕЎ.